# КУЛЬТУРА ПАМЯЦІ БЕЛАРУСКІХ ВЯСКОЎЦАЎ: ДАКУМЕНТЫ, УСПАМІНЫ, АРТЭФАКТЫ

***В. С. Іванова***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4 220030, г. Мінск, Беларусь, ivanovavs@bsu. by*

У кантэксце memory studies і катэгорыі калектыўнай (культурнай, сацыяльнай) памяці вясковай супольнасці аналізуюцца накірункі і механізмы яе трансфармацыі з традыцыйнай (вуснай, камунікатыўнай) ва ўласна культурную і гістарычную. Калектыўную памяць вясковай супольнасці можна разглядаць як архіў у сучасным постмадэрнісцкім разуменні, які ўключае ў сябе не толькі зафіксаваныя дакументальна, але і іншыя праявы памяці, якія дазваляюць групе ці яе членам захоўваць сваю ідэнтычнасць. Сучаснымі формамі перадачы памяці вяскоўцаў з'яўляецца мастацкая самадзейнасць (запіс і ўзнаўленне традыцыйных спеваў), рэканструкцыя традыцыйных святаў, стварэнне аматарскіх фільмаў, напісанне ўспамінаў, вершаў, апавяданняў, гістарычных краязнаўчых нарысаў і ў рэдкіх выпадках навуковых прац.

***Ключавыя словы:*** памяць; калектыўная (сацыяльная, культурная) памяць; калектыўная ідэнтычнасць сялянскай супольнасці; месцы памяці; успаміны.

# КУЛЬТУРА ПАМЯТИ ЖИТЕЛЕЙ БЕЛАРУССКОЙ ДЕРЕВНИ: ДОКУМЕНТЫ, ВОСПОМИНАНИЯ, АРТЕФАКТЫ

***О. С. Иванова***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4,, 220030, Минск, Беларусь, ivanovavs@bsu. by*

В контексте memory studies и категории коллективной (культурной, социальной) памяти сельского сообщества анализируются направления и механизмы её трансформации из традиционной (устной, коммуникативной) в культурно-историческую. Коллективную память сельского сообщества можно рассматривать как архив в современном постмодернистском смысле. Он который включает в себя не только задокументированные, но и другие проявления памяти, которые позволяют группе или ее членам сохранять свою идентичность. Современные формы передачи памяти жителей деревни – это художественная самодеятельность (запись и воспроизведение традиционных песен), воссоздание традиционных праздников, создание любительских фильмов, написание мемуаров, стихов, рассказов, исторических очерков и, в редких случаях, научных трудов.

***Ключевые слова:*** память; коллективная (социальная, культурная) память; коллективная идентичность крестьянского сообщества; места памяти; воспоминания.

# CULTURAL MEMORY OF BELARUSIAN PEASANTS: DOCUMENTS, MEMORIES, ARTIFACTS

***V. S. Ivanova***

*Belarusian State University,*
*Independence Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, ivanovavs@bsu. by*

In the context of the memory studies and the category of collective (cultural, social) memory of the rural community, the directions and mechanisms of its transformation from traditional (oral, communicative) to cultural and historical are analyzed. The collective memory of the peasant community can be seen as an archive in the modern postmodernist sense, which includes not only documented but also other manifestations of memory that allow the group or its members to preserve their identity. Modern forms of transmitting the memory of the peasants are: amateur art (recording and reproduction of traditional songs), reconstruction of traditional holidays, making amateur films, writing memoirs, poems, stories, historical essays and, in rare cases, scientific works.

***Key words:*** memory; collective (social, cultural) memory; collective identity of the peasant community; places of memory; memories.

*Памяць – гэта гіганцкая праца па ўпарадкаванні матэрыяльных слядоў таго, што мы не можам запомніць, і бясконцы спіс таго, што нам, магчыма, спатрэбіцца ўспомніць.*

*П'ер Нара [1, с. 28]*

Паняцце памяці было ўведзенае ў шырокі навуковы зварот французскім сацыёлагам Марысам Хальбваксам у 20-я гг. ХХ ст. [2] Даследаванні ў гэтым накірунку былі працягнутыя ў другой палове ХХ ст. французскім гісторыкам Пьерам Нара, а пасля і іншымі навукоўцамі розных галін ведаў ад філосафаў да псіхолагаў. Вакол паняцця памяці з канца 1980-х гг. склалася новая парадыгма навук, т. зв. *memory studies* [3], якія вызначаюць яе значэнне і накірункі вывучэння ў шырокім спектры дысцыплін і міждысцыплінарных узаемасувязяў. Па меркаванні Хальбвакса, памяць – з'ява сацыяльная. Існуе столькі ж памяцяў, колькі сацыяльных груп і нават індывідаў. Яна пастаянна трансфармуецца ў выніку працэсаў запамінання і амнезіі. Памяць – з'ява практычная і нерэфлексіўная, існуе ў межах канкрэтнай сацыяльнай групы і дзейнічае як пэўны механізм яе развіцця, але як толькі пачынаецца працэс асэнсавання – яна памірае. Памяць вельмі адчувальна ўбірае ў сябе розныя ўплывы і знешнія ўздзеянні, можа перажываць працяглыя схаваныя перыяды ці раптоўныя ажыўленні. Яна ўкараняецца ў канкрэтных рэчах: прасторы, дзеяннях, калектыўных вобразах ці канкрэтных аб'ектах. Можа фіксавацца і вывучацца як з'ява мінулага. У структуры катэгорыі памяці вылучаецца некалькі аспектаў: інфармацыйны (факты), дзейнасны (мадэлі паводзін), каштоўнасны (ацэнкі), эмацыйны (адносіны да фактаў).

Найбольшую ўвагу даследчыкі (М. Хальбвакс, П. Нара, А. Ассман і інш.) звярталі на пытанне трансфармацыі памяці, яе пераходу з жывога, актуальнага стану ў стан зафіксаваны, мёртвы, але даступны для

вывучэння. М. Хальбвакс адзначаў: «Пакуль успамін працягвае існаваць, няма неабходнасці фіксаваць яго пісьмова, ды і ўвогуле фіксаваць… Калі памяць пра нейкую чараду падзей перастае падтрымліваецца групай, якая была іх сведкам ці пачула жывое апавяданне пра іх ад першых удзельнікаў ці назіральнікаў, калі гэтая памяць распыляецца па некалькіх індывідуальных свядомасцях, закінутых у новыя супольнасці, якія ўжо не цікавяцца гэтымі падзеямі, таму што яны для іх вызначана з'яўляюцца вонкавымі, – тады выратаваць гэтыя ўспаміны можна, толькі пісьмова зафіксаваўшы іх у форме аповяду – бо словы і думкі паміраюць, а тэксты застаюцца» [2].

Калі жывой памяці ўжо няма і яна пачынае знікаць, то ўзнікае патрэба ў стварэнні архіваў, адзначэнні гадавінаў, святкаваннях, мемарыялізацыі ў выглядзе помнікаў, назваў вуліц і інш. Гэтыя адбіткі памяці па выразу П. Нара – гэта «моманты гісторыі, адарваныя ад плыні гісторыі, але зноў вернутыя ёй. Гэта ўжо не зусім жыццё, але яшчэ і не зусім смерць, як ракавінкі, якія засталіся ляжаць на беразе пасля адліву мора жывой памяці» [1, с. 31].

П’ер Нара ў сваіх даследаваннях супрацьпаставіў паняцці памяці і гісторыі, ці гістарычнай і сацыяльнай памяці. Ён адзначаў, што ў параўнанні з гісторыяй, якую ствараюць навукоўцы, памяць прэтэндуе на жывую ісціну, якая можа разглядацца як больш значная і сапраўдная. Апошнія даследаванні ў галіне memory studies, прапануюць выйсці за межы гэтай апазіцыі паняццяў і разглядаць іх як розныя спосабы запамінання ў культуры. Гэты падыход зыходзіць з базавага разумення таго, што мінулае не дадзена нам ў аб’ектыўнай рэальнасці, але перманентна ствараецца, распрацоўваецца і перабудоўваецца. У выніку існуюць розныя спосабы запамінання ідэнтычных мінулых падзеяў. Вайну, напрыклад, можна ўспомніць як міфічную падзею («вайна як апакаліпсіс»), як частку палітычнай гісторыі («Першая сусветная вайна як вялікая катастрофа XX стагоддзя»), як траўматычны досвед («жах акопаў, снарадаў, шквал стрэлаў» і г. д.), як частку сямейнай гісторыі («вайна, падчас якой служыў мой дзед») і інш., што несумненна дапамагае развіццю ўяўленняў пра мінулае [3].

Традыцыйныя механізмы перадачы памяці ў межах сацыяльных груп носяць ірацыянальны, нерэфлексіўны характар і звязаны з рытуалізаваным узнаўленнем сацыяльнага вопыту (навыкаў працоўнай дзейнасці, узаемаадносінаў з прыродай, вышэйшымі сіламі і інш.). У «чыстым» выглядзе такі спосаб існавання памяці сустракаецца ў архаічных

грамадствах на стадыі іх дапісьмовага развіцця. Памяць, якая фарміруецца і перадаецца такім спосабам называецца камунікатыўнай (Я. Асман). Другі спосаб фармавання і трансляцыі памяці базуецца на знешніх ў адносінах да групы намаганняў па працы з памяццю: выяўлення ўяўленняў групы аб сваім мінулым, ўнікальнасці, гераічных і траўміруючых падзеях і інш. Гэты від памяці Я. Ассман назваў культурнай [4], а М. Хальбвакс – калектыўнай[5].

Культурная памяць – гэта адносна ўстойлівая сістэма значных для групы ўяўленняў пра мінулае, якія транслююцца ў абагульнена-сімвалічных і ўніверсальна даступных формах, што спараджае пэўныя каштоўнасныя арыентацыі і мадэлі паводзінаў яе членаў групы, і праяўляюцца ў рытуальна-святочных і камемаратыўных практыках[4]. Мінулае паўстае тут праз сімвалічныя фігуры, на якіх будуецца памяць (помнікі культуры, сацыяльныя традыцыі, міфы). У культурнай памяці факталагічная гісторыя пераўтвараецца ў гісторыю, створаную ўспамінам. Яе носьбітамі з’яўляюцца шаманы, барды, пісьменнікі, навукоўцы, настаўнікі і інш. Культурная памяць у адрозненне ад гістарычнай з’яўляецца больш натуральнай, карыстаецца іншымі механізмамі перадачы: утрымлівае толькі найбольш значнае мінулае, выконваючы арыентуючую і нарматыўную функцыі. У бяспісьмовых культурах яна не абапіраецца на тэксты, але транслюецца праз абрады, танцы, гульні, маскі, вобразы, рытмы, мелодыі, ежу, месцы, касцюмы, упрыгожванні, зброю. У гэтым выпадку прастора таксама гуляе значную ролю, і паўстае ў выглядзе «месцаў памяці» (П. Нара) [5, С. 14–29].

Блізкае значэнне мае і паняцце культуры памяці як набора сродкаў і механізмаў, з дапамогай якіх сацыяльная група захоўвае, транслюе і ўзнаўляе сваю ідэнтычнасць. Культура тут выступае як інструмент фіксацыі і перадачы памяці. Яна патрабуе не толькі эмпірычнага, але і тэарытычнага асэнсавання з ўлікам розных прыватнанавуковых падыходаў. Яна з’яўляецца канектыўнай, звязвае аб’екты ў сацыяльным і часавым вымярэнні. Асноўны яе прынцып – паўтарэнне і ўспамін. Сутнасць пераходу ад вуснай да пісьмовай фіксацыі культуры заключаецца ў пераходзе ад паўтарэння культурных канонаў да іх уваскрашэння (узнаўлення, успаміну). Узнікае новая структура, заснаваная не на перайманні і захаванні, а на трактоўцы і ўзгадванні [5, С. 14–29].

---

[5] М. Хальбвакс з’яўляецца аўтарам паняцця калектыўнай памяці, як памяці пра мінулае асобнай групы людзей, якая падкрэслівае асаблівасці гэтай групы, адрознівае яе ад іншых. Калектыўная памяць уключае ў сябе падзеі мінулага, не звязаныя з непасрэдным досведам канкрэтнага чалавека, але вядомыя яму дзякуючы пераказам іншых.

Вывучэнне сялянства як сацыяльнай групы з уласнымі асаблівасцямі і калектыўнай памяццю пачало набываць актуальнасць сярод гісторыкаў (сяляназнаўцаў), сацыёлагаў, этнографаў, антраполагаў, вусных гісторыкаў з 60-х гг. XX ст. Па меркаванні П'ера Нара гэты перыяд можна вызначыць як пачатак «канца сялянства», які ў сярэдзіне 1970-х гг. стаў «адчувальны амаль фізічна», праз істотнае зніжэнне долі сельскага насельніцтва. Памяць вёскі ад гэтага часу заставалася жыць «толькі ў навуковай або сентыментальнай рэканструкцыі». Адбыўся разрыў паміж памяццю і гісторыяй, адначасова ўзнікла патрэба ў захаванні традыцыі (спадчыны) [1].

Перыяд 1970-х гг. у Беларусі характарызуецца, з аднаго боку, пэўным росквітам сацыяльнага і эканамічнага жыцця вёскі, з іншага хуткімі тэмпамі ўрбанізацыі: ў 1976 г. колькасць гарадскога насельніцтва перавысіла 50% (у Францыі, напрыклад, гэта адбылося яшчэ ў даваенны перыяд). «Канец вёскі» зацягнуўся на паўстагоддзе. І нягледзячы на тое, што жывая памяць вясковай супольнасці сёння амаль сыйшла ў нябыт, ў 2018–2019 гг. можна было паспець зафіксаваць яе асобныя рэліктавыя культурныя рысы праз успаміны прадстаўнікоў даваеннага пакалення, дакументы, артэфакты, «месцы памяці», спевы, ўзнаўленне абрадаў, аддзення, характарыстыку моўных асаблівасцяў [6]. Менавіта 1970-я гг. можна вызначыць як перыяд, калі пачалі істотна змяняцца механізмы перадачы памяці ад традыцыйных (вусных)[6], да новых пісьмовых ці нацыянальна-культурных. Для ўраджэнцаў вёскі, якія пераязджалі ў горад, памяць сялянскай супольнасці падавалася ўжо непатрэбнай, несучаснай і нават шкоднай. Каб адаптавацца да новых гарадскіх умоў жыцця патрэбны былі новыя культурныя мадэлі і жыццёвыя стратэгіі, якія істотна адрозніваліся ад вясковых.

Мадэлі паводзін жыхароў вёскі базуюцца на традыцыйных сялянскіх каштоўнасцях. Селянін мусіў працаваць усё жыццё на зямлі, без гэтага немагчыма было выжыць і таму культывавалася любоў да працы і каштоўнасць валодання зямлёй, што праяўлялася нават у фальклорных вобразах, прымаўках, стратэгіях стварэння сем'яў, імкненні да валодання і працы на ўласнай зямлі і гаспадарцы. Важнай была вера ў вышэйшыя сілы, няверуючы чалавек ў вёсцы быў нечым незвычайным і выпадаў з

[6] Для ілюстрацыі механізмаў перадачы памяці, якія бытавалі ў вёсцы яшчэ у сярэдзіне XX ст. можна прывесці наступны успамін: *«[У] пасляваенныя гады, [як] святы наступалі зімовыя. Каляды. Калі людзі не працавалі. Мы хадзілі [да] дзеда Сымона. Збіраліся мужыкі, размаўлялі. Яны расказвалі пра вайну. Дзе хто як ваяваў. Яны размаўлялі пра палітыку, пра цяжкасці, якія ў іх ёсць. І мяне бацька браў. Мне цікава было паслухаць. Дзяўчынак не вадзілі". (Міхаіл Лось, в. Ліпляны, Лельчыцкі р-н)*

супольнасці, без якой ў традыцыйнай вёсцы фактычна не мог існаваць. Калектыўная памяць сялян у сваёй аснове мела рысы міфічнасці, фаталістычнасці і негераічнасці, была засяроджана на нялёгкай долі чалавека, салідарнасць якога гуртавалася вакол неабходнасці выжывання. Сярод асаблівасцей сялянскага светапогляду адзначаецца таксама адзінства прыроднага, гаспадарчага, сакральнага і сацыяльнага, звяртаецца ўвага на лакальнасць і замкнёнасць сялянскай прасторы, рытмічнасць працы на зямлі, культ продкаў, шанаванне і захаванне памяці аб іх, адчуванне духоўнай сувязі і сацыяльнай агульнасці [7, 8].

Найбольш ярка гэтыя асаблівасці праяўляюцца ва ўспамінах, фальклоры, абрадах, мове, «месцах памяці», замкнёных ў прасторы вёскі. У той час як дакументаванне (сямейныя архівы) з'яўляюцца рэдкасцю, ў пэўнай ступені характэрныя больш для прадстаўнікоў вясковай інтэлегенцыі (настаўнікаў, святароў, кіраўнікоў) і сустракаюцца спарадычна і несістэмна [9]. Праз вусныя ўспаміны, якія жыхары вёскі традыцыйна пераказвалі сваім дзецям і ўнукам перадаваліся не толькі асноўныя каштоўнасці і мадэлі паводзінаў, але і памяць пра падзеі. У пераважнай большасці выпадкаў нават асабістыя падзеі жыцця змяшчаліся ў кантэкст жыцця вёскі (супольнасці) і даволі рэдка выходзілі за яе межы. Вёска з'яўлялася цэнтрам і пачаткам сусвету. З канца 1970-хх гг. механізм перадачы жывой памяці, як ўжо адзначалася, пачаў страчваць сваю эфектыўнасць, а успаміны вяскоўцаў станавіліся ўсё больш аб'ектам цікавасці спачатку краязнаўцаў, а пазней і прафесійных навукоўцаў (гісторыкаў, этнографаў, антраполагаў і інш.).

У пачатку XXI ст. навукоўцамі фіксаваўся дастаткова шырокі спектр тэматычных сюжэтаў і падзей, якія прамаўляліся і асэнсоўваліся вяскоўцамі праз прызму ўласнага лёсу і жыцця вёскі. Частка гэтых тэм, як напрыклад, паўстанне 1863–1864 гг., выступалі выключна ў форме постпамяці, пераказваліся са слоў іншых, рэканструяваліся на падставе markdown рознага кшталту сведчанняў, крыніц і ўласных разважанняў. Ва ўспамінах фіксаваліся такія падзеі XX ст. як: выезды на заробкі ў Амерыку ці глыб Расіі, Першую сусветную вайну (бежанства), жыццё «за польскім часам» (1921–1939), калектывізацыя сельскай гаспадаркі да і пасля вайны, рэпрэсіі, «першыя Саветы» (1939–1941 гг.), вайна, антысавецкі пасляваенны супраціў, пасляваенная штодзённасць (праца ў калгасе), Чарнобыльская катастрофа, перабудова, заняпад вёскі з канца 1990-х гг. [10, С. 207–209] Цэнтральнай падзеяй калектыўнай памяці вяскоўцаў стала Другая сусветная вайна. Ступень траўматычнасці падзей стагоддзя

маркіравалася праз эмоцыі рэспандэнтаў у працэсе згадвання, дэталізацыю і індывідуалізацыю падзей, немагчымасць іх абагульнення. Аповеды пра менш траўматычнае стваралі больш іранічных і фалькларызаваных вобразаў, што характэрна, напрыклад, для тэм пра пасляваенную калектывізацыю, штодзённасць калгасаў і Чарнобыльскую катастрофу [11].

Цяпер гэтая памяць існуе ўжо пераважна ў форме этнаграфічных і вуснагістарычных архіваў [12], летапісаў вёсак, пісьмовых і друкаваных успамінаў, краязнаўчых і навуковых прац [13]. У меншай ступені перадаецца як жывая сямейная памяць, ці рэканструкцыя традыцый і абрадаў канкрэтнай вясковай супольнасці, паколькі такія механізмы ўсё яшчэ з’яўляюцца новымі, не апрабаванымі і складаным для рэалізацыі для былых ці існых вяскоўцаў. Сучасная свядомасць прадстаўнікоў гэтай сацыяльнай групы будуецца пераважна на настальгічным вобразе вёскі, спробах аднаўлення і захавання старажытнай вясковай культуры для замацавання і трансляцыі ўласнай і калектыўнай ідэнтычнасці. Разбурэнне традыцыйных механізмаў перадачы памяці падштурхоўвае да пошуку і выпрацоўкі новых.

Адным з асноўных эмацыйных рухаючых фактараў для рэалізацыі новых стратэгій захавання памяці з’яўляецца настальгія па страчанай вясковай супольнасці і прасторы, а таксама пошукі ўласнай ідэнтычнасці, якая б будавалася на сямейнай гісторыі і гісторыі вёскі. Як прыклад можна прывесці в. Ліпляны, Лельчыцкага р-на. Для ліплянцаў сучаснымі механізмамі перадачы памяці з’яўляюцца мастацкая самадзейнасць, летапіс вёскі, Дзень вёскі, традыцыйныя святы (Купалле, Дажынкі і інш.), стварэнне фільмаў, вершаў, апавяданняў. У іх вусных успамінах выразна бачны настальгічны вобраз вёскі і жаданне зафіксаваць памяць і перадаць яе сваім нашчадкам:

*Пасля пяцідзесяці, сапраўды, карані, дадому хочацца. І Ліпляны мяне цягнуць. Самыя яркія ўражанні, вядома, былі і застаюцца тут. (Людміла Ашомка)*

*Я много раз разлуку адчуваю, Удалечыні ад роднага сяла. Мяне далёка ад раднога краю, Майго жыцця дарога завяла. Хоць час сцірае дарагія рысы, І толькі з яркіх астаўляем муць. Іх вобраз неяк часу не даліся. І ўсё часцей у памяці устаюць. Устаюць яны, як я закрыю вочы. Устаюць яны як марыць я пачну. Як бы сказаць яны мне вельмі хочуць. Каб я да іх хоць на дзень зазірнуў. (Уладзімір Паўлечка)*

*Мне вельмі шкада, што мае дзеці сёння жывуць і праводзяць амаль увесь час у Мінску... Што з'яўляецца іх радзімай? Двор? Дом, у якім мы жывём? Складана ўявіць, якое месца яны будуць называць радзімай. Чым далей, чым сталейшым я раблюся, тым больш разумею, што Ліпляны – гэта маё адзінае роднае месца на зямлі. Я вельмі зайздрошчу мінчукам, у якіх гэта месца – Мінск. Таму што яны маюць магчымасць і жыць, і працаваць, і займацца звычайнымі рэчамі, знаходзячыся ў гэтым месцы. Ліпляны – гэта для мяне тая адзіная, маленькая радзіма, дзе ўсё ўспрымаецца зусім па-іншаму. Я люблю прыроду. Але калі я бачу гэтую ж прыроду, а то яшчэ і прыгажэй, там дзесьці ў Еўропе – гэта зусім не выклікае тых эмоцый, як у Ліплянах. Хоць я паўжыцця пражыў у Мінску, паўжыцця ў Мікашэвічах, але цалкам відавочна, што я ніколі не назаву ні Мікашэвічы, ні Мінск радзімай, колькі б часу тут не жыў і якія б падзеі мяне не звязвалі з гэтымі месцамі. Ліпляны – гэта тая адзіная маленькая радзіма, з якой свет успрымаецца па-іншаму. (Ігар Жабароўскі)* [14, С. 8, 12, 269].

Пры трансфармацыі камунікатыўных стратэгій і механізмаў адбываюцца і змены адносінаў да сямейных артэфактаў, якія страчваюць сваё практычнае, а часта і эмацыйнае значэнне. Швейная машынка, якая была выратаваная ў вайну і абшывала ўсю вёску доўгі час, ці адзіны на вёску даваенны ручнік, з якім хаваліся ў балотах – у лепшым выпадку стануць музейнымі экспанатамі «без гісторыі», сэнсавага і эмацыйнага напаўнення, якое яны мелі для асобных членаў сям’і і супольнасці. Але сёння адным вельмі выразным сродкам фіксацыі калектыўнай памяці вёскі і настальгіі з’яўляецца сама яе прастора – бацькоўскія хаты, могілкі, мікратапанімія і інш.

Калі зноў звярнуцца да ілюстрацыі на прыкладзе в. Ліпляны, то там можна вылучыць некалькі такіх месцаў. Першае, гэта т. зв. Цвінтар, дзе па легендзе з’явілася на дрэве ікона Маці Божай і была пабудаваная капліца. Капліца была спалена ў вайну і цяпер рэканструюецца. Найбольш старажытным артэфактам на тэрыторыі вёскі можна лічыць каменны крыж на могілках, з выразнымі антрапаморфнымі (чалавекападобнымі) прыкметамі. Гісторыі аб яго з’яўленні зафіксаваныя не былі і зыйшлі ў нябыт. Але цікава тое, што крыж за апошні час перажыў т. зв. другасную міфалагізацыю: на ім з’явіліся стужкі, кветкі, ручнікі, а таксама скрынка з грашыма. Гэта адбылося пад уздзеяннем шырокай папулярызацыі легендаў пра тураўскія крыжы па ўсім рэгіёне, а таксама звязана з узнаўленнем цікавасці мясцовых жыхароў да старажытнай спадчыны.

Вельмі важным «месцам памяці» ліплянцаў з'яўляецца адзіная даваенная хата, якая ацалела падчас вайны і выратоўвала вяскоўцаў ад холаду. І нарэшце важнае значэнне маюць месцы, якія фіксуюцца пра мікратапанімію і звязаныя з пэўнымі падзеямі жыцця вёскі (Дзярытак, Елье, Цвінтар і інш.)

*На Дзярытку праходзілі часцей за ўсё танцы. Тут, калі праводзілі ў армію, малады чалавек кідаў хустачку. Развітваўся з усімі. Тут яго і сустракалі, калі ён адслужыў належны тэрмін. [Тут пасля вайны] інваліды начавалі для таго, каб з раніцы пайсці збіраць у людзей міласціну. Тут жа цыганскія буды начавалі і плытагоны, якія гналі лес. І заўсёды праз масток дзяжурыў адзін чалавек (Міхаіл Сечка)*

*Падчас вайны Елье было такое, што чалавеку невялікага росту можна было схавацца. Гэта 70–80 гадоў гэтаму лесу. Людзі хаваліся там, каб немцы ці паліцаі не маглі дастаць. (Уладзімір Паўлечка)*

*У Лузе Марыю [Лось] расстралялі. Там магілка была. Казалі «Мар'іна магіла». Яе дочка, як меліярацыя праходзіла, бегала да казала: «Хаця б магілу не заарыце». Так яе і пакінулі, яна абгароджаная стаіць. У Лузе. (Ніна Лось)* [14, С. 40–51]

Такім чынам, асаблівасці культурнай памяці вяскоўцаў дазваляюць казаць аб даволі сціплых выніках яе дакументавання. У агульным архіве «калектыўнай памяці вёскі», дакументальныя сведчанні маюць другаснае значэнне і часта ўспрымаюцца як знешнія, чужыя, не характэрныя для дадзенай супольнасці. Найбольш значнымі яе праяўленнямі з'яўляюцца успаміны, што за апошнія часы перажылі трансфармацыю механізмаў перадачы, прастора вёскі, што праяўляецца ў наяўнасці месцаў памяці вясковай супольнасці. Сучаснымі формамі перадачы памяці вяскоўцаў з'яўляецца мастацкая самадзейнасць (запіс і узнаўленне традыцыйных спеваў), рэканструкцыя традыцыйных святаў, стварэнне аматарскіх фільмаў, напісанне успамінаў, вершаў, апавяданняў, гістарычных краязнаўчых нарысаў і ў рэдкіх выпадках навуковых прац. Па сутнасці мы маем справу з сучаснай формай архіва, які ўключае ў сябе пераважна нефіксаваную дакументальна інфармацыю і зыходзіць з пэўнага вобразу, які група мае, захоўвае і транслюе для захавання ідэнтычнасці.

**Бібліяграфічные спасылкі**


1. Нора П. Франция-память. СПб., 1999.
2. Хальбвакс М. Коллективная и историческая память. Электрон. рэсурс: Неприкосновенный запас. 2005. № № 2–3. Рэжым доступу: http:// magazines. russ. ru/nz/2005/2/ha2. html Дата доступу: 19. 09. 2021.

3. Cultural memory studies: an international and interdisciplinary handbook / edited by Astrid Erll, Ansgar Nünning. Berlin, 2008.
4. Шуб М. Л. Социальная, коллективная и культурная память: новый подход у определению смысловых границ понятий // Обсерватория культуры. 2017. Т. 14. № 1. С. 4–11.
5. Ассман Я. Культурная память: Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности / Пер. с нем. М. М. Сокольской. М., 2004.
6. Іванова В. Ліпляны. Біяграфія і штодзённасць беларускай вёскі. Мінск, 2019. 404 с.
7. Engelking A. Kołchoznicy. Antropologichne studium tożsamości wsi Białoruskej prszelomy XX i XXI wieku. Toruń, 2012.
8. Щеглова Т. К. Деревня и крестьянство Алтайского края в XX веке. Устная история. Барнаул, 2008.
9. Сямейныя архівы беларускіх вяскоўцаў і іх лёсы падчас Другой сусветнай вайны // Архивы и война. К 75-летию Победы над фашизмом [Электронный ресурс]: материалы междунар. науч. конф., Минск, 4 нояб. 2020 г. / Белорус. гос. ун-т; под общ. ред. А. Г. Кохановского; науч. ред. М. Ф. Шумейко. Минск: БГУ, 2021. С. 47–54.
10. Параўнайце з тэмамі інтэрв'ю вяскоўцаў з Алтайскага краю Расіі: Щеглова, Т. К. Устная история: учеб. пособие. Барнаул, 2011.
11. Іванова, В. Прамоўленая гісторыя: XX ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі. Мінск, 2018.
12. Беларускі архіў вуснай гісторыі. [Электрон. рэсурс]. URL: http://nashapamiac.org. Дата доступа: 20. 04. 2020
13. Гл. напрыклад: Маисейко Н. Н. Деревня Лука. 2002; Кісялёў У. М. Параненыя ўспаміны: з акупацыйнага жыцця вёскі Дараганава. Мінск, 2010 і інш.
14. Іванова В. Ліпляны. Біяграфія і штодзённасць беларускай вёскі. Мінск, 2019.